# У ТВОРЧЫМ РОСКВІЦЕ

Філалагічны факультэт нашага універсітэта пачатак сваёй гісторыі бярэ з 1922 года, з моманту аргашзацыі літаратурна - лінгвістычнага аддзялення пры педфаку БДУ. Можна з поўнай адказнасцю сцвярджаць, што філфаку належыць рашаючая роля ў развіцці беларускай філалагічнай навукі. За ўсе гады свайго існавання ён падрыхтаваў тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх сталі буйнейшымі вучонымі, пісьменнікамі, дзеячамі народнай адукацыі і беларускай нацыянальнай культуры. Для прыкладу зазначым, што толькі за пасляваенныя гады факультэт падрыхтаваў каля 3.500 спецыялістаў у галіне беларускай і рускай філалогіі, звыш 100 дактароў і кандыдатаў філалагічных навук, 50 выпускнікоў сталі членамі Саюза пісьменнікаў БССР.

Цяпер на стацыянары і вячэрнім аддзяленні факультэта займаецца 1.607 студэнтаў. На 8 яго кафедрах працуюць вядомыя вучоныя-філолагі, сярод якіх 10 прафесараў і дактароў навук.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка кадраў па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай і рускай мове і літаратуры і рускай мове і літаратуры. Паралельна з чытаннем лекцый па філалагічных агульнаадукацыйных дысцыплінах вялікае значэнне надаецца і спецыялізаваным заняткам, якія ўводзяцца з III курса для таго, каб кожны студэнт на працягу апошніх год вучобы працаваў у выбраным ім спецсемінары. У кожным такім спецсемінары займаецца 5—10 чалавек з тым разлікам, каб работа ў ім заканчвалася напісаннем дыпломнай работы. Кіруюць такімі заняткамі, як правіла, вядучыя вучоныя: прафесары М. Г. Булахаў, М. А. Жыдовіч, М. Р. Ларчанка, А. А. Лойка, І. Я. Навуменка, А. Я. Супрун, Л. І. Фіглоўская, Л. М. Шакун, дацэнты П. П. Шуба, Б. П. Міцкевіч, В. В. Казлова, І. П. Кахно і некаторыя іншыя.

Філалагічны факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з многімі універсітэтамі Савецкага Саюза (напрыклад, МДУ імя Ламаносава, Вільнюскім, Ленінградскім універсітэтамі), а таксама з многімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі зарубежных краін — Іенскім універсітэтам (ГДР), Варшаўскім універсітэтам і Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школай (ПНР), з Сафійскім універсітэтам (БНР), з Люблянскім універсітэтам (Югаславія). Штогод студэнты-філолагі і навуковыя работнікі выязджаюць у названыя ВНУ, дзе удасканальваюць свае веды па балгарскай, славенскай, польскай і нямецкай мовах. У сваю чаргу філфак прымае студэнтаў і выкладчыкаў з Польшчы, ГДР, Балгарыі, Югаславіі і ЧССР.

Пры кожнай кафедры філалагічнага факультэта створаны студэнцкія навуковыя гурткі, у якіх займаецца каля 700 чалавек. Лепшыя навуковыя работы маладых даследчыкаў прадстаўляюцца на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых прац. У адпаведнасці з існуючымі дагаворамі многія студэнты штогод выязджаюць з дакладамі ў іншыя ВНУ краіны. Акрамя таго, на факультэце працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, а таксама разнастайныя спартыўныя секцыі.

У сёлетнім навучальным годзе ўся вучэбная і палітыка-выхаваўчая работа на факультэце праводзіцца ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Хачу выказаць упэўненасць, што калектыў студэнтаў і выкладчыкаў філфака зробіць усё магчымае, каб дастойна сустрэць гэты слаўны юбілей.

**У. ЛАЗОЎСКІ,**
намеснік дэкана.



*Усю адказнасць, сур'ёзнасць і урачыстасць Ленінскага заліку адчувае студэнтка II курса беларускага аддзялення Валянціна Карпачэўская.* *Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# АЦЭНКУ ДАЮЦЬ ТАВАРЫШЫ

Ва усіх групах факультэта праходзяць сходы, дзе камсамольцы здаюць Ленінскі залік. Камісіі па прыёму заліку правяраюць веданне камсамольцамі ленінскай тэарэтычнай спадчыны, актыўнасць у грамадскім жыцці.

На факультэце праведзена ленінская юбілейная канферэнцыя па грамадазнаўчых навуках, а на трэцім курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры ленінская канферэнцыя была праведзена сіламі камсамольцаў курса. Устаноўлены сувязі з падшэфнымі школамі — Нававёскаўскай сярэдняй і Русакскай васьмігадовай. Перададзена ужо першая бібліятэчка, прачытаны першыя лекцыі, паказана некалькі канцэртаў мастацкай самадзейнасці. Вялікая бібліятэчка (звыш 300 экземпляраў) сабрана для Нававёскаўскай школы, рыхтуецца бібліятэчка дзіцячай літаратуры для Русакскай школы.

На гэтым тыдні ва усіх групах факультэта будзе здадзены Ленінскі залік. Паспяхова прайшла ужо атэстацыя на першых і другіх курсах, заканчваецца на трэціх і чацвёртых. Сур'ёзна рыхтаваліся да гэтага сходу студэнты нашай лепшай групы факультэта, дзе камсоргам Н. Алейнікава, першай і трэцяй груп III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры і іншыя.

Ленінскі залік ярка адлюстроўвае актыўнасць і сумленне камсамольцаў нашага факультэта, дзе прынцыповую ацэнку кожнаму камсамольцу, яго справам і учынкам даюць таварышы.

**Л. КАХНОВІЧ,**
сакратар камітэта камсамола філфака.

# НЕПАГАСНЫ ЖАР МАЛАДОСЦІ

«У з н а гароджваецца граматай ЦК ЛКСМБ студэнтка V курса філалагічнага факультэта Меланьіна Ірына Анатольеўна...»

Калі на першым злёце выдатнікаў БДУ прагучалі гэтыя словы, у маёй памяці ажыло усё, што звязана з вучобай і грамадскай работай на факультэце «круглай» выдатніцы, намесніка сакратара камітэта камсамола філфака па вучэбнай і навуковай рабоце І. Меланьінай.

Пасля выбрання новага саставу камітэта камсамола яго членам некалі было раскачвацца. Невысокі сярэдні бал паспяховасці, больш 20 працэнтаў непаспяваючых пасля летняй сесіі, пропускі заняткаў без уважлівых прычын, слабая зацікаўленасць да грамадскай работы у многіх студэнтаў і г. д.—усё гэта гаварыла аб тым, што камітэт камсамола павінен прыняць тэрміновыя меры. Ірына Меланьіна ведала, што ёй трэба рабіць. Ствараецца акадэмічны савет факультэта. які узначаліла намеснік сакратара І. Меланьіна.

Задачы і мэты былі дакладна вызначаны у плане работы акадэмсавета: барацьба за умацаванне вучэбнай дысцыпліны, за ліквідацыю акадэмічнай запазычанасці, павышэнне паспяховасці і інш. Пасля — выклікі на камітэт, акадэмсавет хвасцістаў, прагульшчыкаў, камсамольскія спагнанні, выключэнне нядбайных студэнтаў, дапамога курсавым бюро, прамежкавыя залікі перад сесіяй на першым курсе. Усё гэта станоўча уплывала на паляпшэнне паспяховасці, вучэбнай дысцыпліны. Калі сярэдні бал паспяховасці студэнтаў філфака павысіўся на некалькі дзесятых і стаў 4,02, то у гэтым ёсць заслуга камсамольскага актывіста І. Меланьінай, членаў камітэта камсамола і акадэмсавета Ю. Нагорнага, Т. Мінюк, Л. Курачкінай і іншых.

Можна прывесці нямала імён выдатнікаў-актывістаў факультэта, такіх, як А. Бутэвіч, Т. Баганік, Л. Кахновіч, У. Свяжынскі, Н. Няцвет, Р. Апановіч і іншых. Яны уваходзяць у лік 19 выдатнікаў філфака, узнагароджаных граматамі ЦК ЛКСМБ, АК, ГК, РК, рэктарата БДУ і каштоўнымі падарункамі.

Паспяховым быў у гэтым годзе для філолагаў конкурс навуковых студэнцкіх работ: толькі першую катэгорыю атрымалі 17 студэнцкіх даследаванняў. Сярод іх работы студэнтаў V курса Л. Макавеевай, А. Жук, Н. Бабаеўскага, IV курса А. Зянько, Л. Падольскага, Л. Васілеўскай, С. Крэпскага, Я. Качановіч і іншых.

Добрых вынікаў у вучобе і грамадскай рабоце дабілася другая група другога курса аддзялення рускай мовы і літаратуры, заняўшая першае месца на факультэце у спаборніцтве груп у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і трэцяе месца ва універсітэце. Яна атрымала грашовую прэмію. Першымі камсамольцы гэтай групы здалі Ленінскі залік. Плённай была работа цалiннага атрада «Нёман-69». Студэнты асвоілі 120,1 тыс. рублёў капіталаўкладанняў (або на кожнага члена атрада 3400 руб.). Яны пабудавалі пачатковую школу, жылы двухкватэрны дом, два кароўнікі. Акрамя таго, для насельніцтва прачытана будаўнікамі-філолагамі 14 лекцый, дадзена 9 канцэртаў мастацкай самадзейнасці, сабрана школе 50 кніг, ленінская бібліятэчка, спортінвентар, аформлен стэнд, прысвечаны камсамолу Беларусі і 50-годдзю БССР. Добрую памяць пакінулі аб сабе камсамольцы у стэпе Казахстана. За сваю працу яны атрымалі 70 узнагарод — грамат, падзяк і каштоўных падарункаў, а двое—камандзір атрада А. Бутэвіч і Г. Дзядзюля — узнагароджаны медалем «За асваенне цалінных зямель», і іх імёны занесены у летапіс камсамольскай славы БДУ.

Такіх камсамольцаў на факультэце многа. Верныя камсамольскаму доўгу, адданыя Радзіме і партыі, яны дастойна і горда нясуць сцяг, узняты іх дзядамі і бацькамі.

**М. ПІПЧАНКА,**
член партбюро.



*Сярод лепшых студэнтаў факультэта С. КРЭПСКІ, А. БУТЭВІЧ, Т. МІНЮК.*

# ШКОЛА ЛЕКТАРСКАГА МАЙСТЭРСТВА

Пройдуць гады вучобы — і новыя выпускнікі філфака папоўняць шматтысячную армію савецкай інтэлігенцыі. Да іх будуць прад'яўлены вялікія патрабаванні: яны абавязаны быць не толькі кваліфікаванымі спецыялістамі, але і ўмелымі арганізатарамі і выхавацелямі. Набыць гэтыя якасці трэба яшчэ ва універсітэце.

У нас на факультэце авалодаць палітычнымі ведамі, набыць арганізатарскія навыкі дапамагае школа лектарскага майстэрства. Яна ўтварылася ў мінулым годзе. Для маладых лектараў былі прачытаны лекцыі «Аб лектарскім майстэрстве», «Ленін аб камуністычным выхаванні», «Ленін і Горкі», лекцыі, прысвечаныя 50-годдзю БССР і Камуністычнай партыі Беларусі. Вялікай папулярнасцю сярод пачынаючых лектараў карыстаецца цыкл лекцый «Ленінізм і міжнародны рабочы рух», якія чытаюцца навуковымі супрацоўнікамі Маскоўскага інстытута міжнароднага рабочага руху.

Як правіла, студэнты, што навучаюцца лектарскаму майстэрству, выконваюць практычныя заняткі па падрыхтоўцы і чытанню лекцый. Тым, хто робіць тут першыя крокі, даручаецца выступаць перад студэнцкай аўдыторыяй, а найбольш падрыхтаваным — перад працоўнымі горада і вёскі.

За мінулы год студэнты факультэта прачыталі толькі на фабрыцы «Камунарка» звыш 70 лекцый па самай разнастайнай тэматыцы. З удзячнасцю адзываюцца рабочыя аб маладых лектарах, такіх, як А. Віннік, В. Шэлест, Л. Кахновіч, А. Варабей, А. Бурдыка, А. Любіменка, Р. Сяменчык і іншых.

У час летніх канікул студэнты філфака прачыталі звыш 150 лекцый у сельскіх школах, на калгасных дварах, у брыгадах. Сярод найбольш актыўных лектараў Г. Саковіч, З. Кузьміцкая, А. Піліпчык, Т. Дзевялтоўская, К.Юша, Е. Стрыгельская і іншыя.

Цяпер студэнты-прапагандысты праводзяць гутаркі, чытаюць лекцыі і даклады у шасці пашывачных атэлье Мінска, на вагонарамонтным заводзе імя Мяснікова і іншых падшэфных прадпрыемствах.

Цікавасць да паглыбленага вывучэння лектарскага майстэрства ўмела прабуджаюць работнікі раду кафедр факультэта: Л. І. Фіглоўская, А. А. Лойка, І. П. Кахно, М. Б. Яфімава і многія іншыя.

Вельмі важна, каб студэнт бачыў карысць сваёй даследчай працы. Таму выкладчыкі імкнуцца выкарыстоўваць матэрыялы студэнцкіх работ у лекцыйнай прапагандзе. Усё гэта адметна ўплывае на станаўленне будучых спецыялістаў.

Работнікі кафедр факультэта распрацавалі тэматыку лекцый, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, і актыўна выступаюць на прадпрыемствах, ва ўстановах, школах. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца лекцыі «Ленін і Горкі», «Ленін і пытанні літаратуры», «Вобраз Леніна ў савецкай літаратуры», «Ленінская спадчына і праблемы рэалізму» і іншыя.

Яшчэ год назад на факультэце налічвалася 43 члены таварыства «Веды», у асноўным з прафесарска-выкладчыцкага саставу. Сёння арганізацыя налічвае ужо 81 члена таварыства, прычым большасць з іх — студэнты III і IV курсаў факультэта.

**Р. БРАГІН,**
старшыня таварыства «Веды» факультэта.

# МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ ФІЛФАКА

*Юрка ГОЛУБ, студэнт V курса.*

(З КНІГІ «ГРОМ НА ЗЯЛЁНАЕ ГОЛЛЕ»)

## НА НАРАЧЫ

*Генадзю ПАШКОВУ*

Нас возера прысніла.
Нас возера вязло.
І літасці прасіла
Кляновае вясло.
Спакойная вада.
На беразе вуголле.
А нехта спіць, відаць,
У вопратцы на голлі.
Такі спакойны міг.
Зялёны вецер лета.
Хацелі б верыць мы
Яшчэ мацней, чым летась.
Які трывожны міг!
І войны...
І радзіны...
І як блізняты — мы
Пад сэрцам у Радзімы.

***

Нашто бясконцыя тырады
І пустаслоўя шалуха?
Жывому слову кроўна рады,
Як песні,
Промню
І шляхам!
Шукаюць папараць і сушаць
Свае жаданні ля шчакі...
Аднойчы выпархнуць вяснушкі,
Як жаўтаротыя шпакі!
Жанчына узнімецца да сонца
Над светам дрэваў і жывёл.
І скажа дзед, сівы дазорца:
Яшчэ нямала пражывём!
Успыхне радасным бутонам
Спляценне рук над галавой.
І сцяга колерам бунтоўным
Зара запаліць гарызонт.

*Яўгенія ЯНІШЧЫЦ, студэнтка IV курса.*

## ПАЧЫНАЕЦЦА ЎСЕ З ЛЮБВІ...

Пазаві мяне, пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца усё з любві,
Нават самая простая з'ява.
І тады душой не крывіць
Да апошняй крывавай кроплі.
Пачынаецца усё з любві —
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі
І змяняюцца краявіды.
Пачынаецца усё з любві,
Нават ненавісць і агіда.
Пазаві мяне, пазаві.
Сто дарог ляжыць за плячыма:
Пачынаецца усё з любві,
А інакш жыццё немагчыма.

***

Табе дана ад веку мова
Не за мядзяк. Не напавер.
І адкрывай яе нанова,
Як адкрываў яе Гамер.
Ты валадар галосных, зычных,
Што даў табе далёкі род.
Сярод спляцення слоў музычных
Жыве музычны наш народ.
О, час далёкі пышных баляў!
О, гусляры былых вякоў!
Я чую родныя цымбалы,
Што грозна льюцца з-пад акоў.
Гуслярскі лес князі рашылі,
Ды вось наказ кашмарных дзён —
Ніводнай ноткі не сфальшывіць
І зберагчы агонь і звон!..

*Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, студэнтка II курса.*



***

Вясна не квеценню пачнецца,
Вясна пастукае ў сэрца,
Не лікаваннем жаўрука.
Як у акно—твая рука.
Запахне слаба і гаркава
Карой адтаяўшых ствалоў,
Для жыцця — не для забавы —
Пранікне ў кроў,
жывому ў кроў.
Адвечнай смагаю кахання
Запаліць, блытаючы дні...
І нават снегу цёпла стане
Ад чалавечай цеплыні.

*Валянціна ХАМЧУК, студэнтка I курса.*

## Я ПІШУ ТАБЕ З ПОЎДНЯ

Як жывеш, мая родная!
Прывітанне ад сына.
Я пішу табе з поўдня,
Дзе наш бацька загінуў.
Я пішу табе з поўдня, мама.
Не плач па татулю.
Адліліся слёзы В'етнама
У свінцовыя кулі.

***

Вясна, румяны твар зары,
І белы горад над ракою...
Я зноў не ведаю спакою,
І зорка новая гарыць!
Гарыць над шляхам нетароным.
Па ім прakласці першы след,
Адкрыць нязнаны шчодры свет
Завуць трывожныя пероны.
О колькі страт! Даволі, годзе!
І пачынаю зноў і зноў,
Бо чалавек заўжды ў паходзе
Па справядлівасць і любоў.

***

Калі загараюцца ад сонца вясны
Пахучыя свечкі каштанаў,
Нягоды забудзь, як нядобрыя сны,
Прыйдзі да мяне на світанні.
Навокал — абмыты зарою абшар,
Маўчаць задуменныя плёсы...
Я столькі чакала, што ў светлы янтар
Ператварыліся слёзы.

*Мікола КАМАРОЎСКІ, студэнт III курса.*

## ДЗВЕ ЭЛЕГІІ

### 1. МАЦІ.

Лічу лісткі календара...
Чуваць — завеі будзяць цішу.
Яны мяне ў дваццаты раз
Зноў загайдаюць, закалышуць...
І я, нібыта ў лёгкім сне,
Зноў хлапчуком стаю на ветры.
Усё нязвыкла, нова мне.
Здзіўляюся, чаму так светла,
Чаму так светла на душы?
Бяжыць лыжня, і снег у ботах,
Снег паліто зацерушыў,
І маці ціхае: «О божа...»

### 2. БАЦЬКА.

Неба прарвалася. Холадна. Мокра.
Дождж прытанцоўвае на вадзе.
Ты адзін толькі, мабыць, мокнеш
З ранку да вечара — цэлы дзень.
Вось праясніцца ўжо нібыта,
І перастане кіпець рака,
Потым ізноў дажджыць, як праз сіта,
Зноў цыгарэту бярэш у рукаў.
Твой паплавок сіратліва гайдаецца,
Дзесь прытуліўся сярод асакі.
Рыба лавіцца ў дождж не збіраецца,
Выдаўся ж дзень нярыбны такі!
Вецер дымком ад кастра пацягне—
Пачырванеюць, шыпяць вуглі.
Мабыць, дажджу іх заліць не цяжка,
Толькі надзеі адной не заліць.
Вечарам бацьку сустрэну ля весніц
(У торбе не месціцца хвост язя).
Бацька прамоклы,
усміхаецца весела:
— Бачыш, узяў!..

*Людміла ЗАБАЛОЦКАЯ, студэнтка I курса.*

***

Чайка плакала
Сумна і дзіка,
Пілігрыхай уваходзіла ў сны.
Развітальным падсечаным крыкам
Прасвятлення знікалі агні.
І абдорвала шчодра ключамі
Жураўліных паверак любоў.
Ачышчальнаю марай гучалі
І сляпілі фіялкі сабой.
А снягір затаіўся ў жмені
Чысцінёю раскрытых вачэй.
І крывавіла сонца калені,
Калі бегла праз вузкі ручэй.
О ідыліі спавітая чэрствасць,
Маладосці гартанная стынь.
І дажджы шчабятлівыя чэзнуць,
Ападаюць у змрок залаты.
І знікаюць блакітныя коні,
І цярністы наперадзе шлях.
Не забуду ніколі, ніколі
Ручаіны ў вясновых палях.
І сціраюцца нашы паромы,
І цярпліва чакаюць брады.
Сэрца кліча ў вёску, дадому,
Ды бяруць у палон гарады.
Расплятаю дзявочыя косы,
І праводжу сваіх жаўрукоў.
І дзяцінства, дзе бегала босай,
Зачыняю няўмольным замком.

*Мікола ДЗЕМІДОВІЧ, студэнт III курса.*

## ЛОСЬ

Галін тугіх парзаўшы путы
Магутнай пругкасцю грудзей,
Сахаты выбег з цёмнай пушчы
І стаў, убачыўшы людзей.
Яго, узнятага трывогай
З-пад роднай засені ялін,
Перапалоханыя ногі
Сюды знячэўку прывялі.
З-пад стрэлаў хітрых бег з адвечнай
Нямой пушчанскай глухаты
Ад дзікасці нечалавечай
Да чалавечай дабраты.

*Тамара ЧАБАН, студэнтка I курса.*

***

Пахне сонцам і талай зямлёю,
Рыжым снегам і цёплым дажджом,
Зазвінела, звініць без адбою
Ручаямі і капяжом.
Расчыніліся вокны і дзверы,
Заіскрыліся вочы і сны...
Па-дзіцячаму хочацца верыць
У непаўторную шчодрасць вясны.



## ЖЫВЕ ВЯСЁЛАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Жадаючых быць сведкамі турніру вясёлых і знаходлівых аказалася намнога больш, чым магла змясціць актавая зала галоўнага корпуса. Ой, як хацелася кожнаму трапіць сюды! Тыя, хто не меў запрашальных білетаў, праяўлялі максімум знаходлівасці, каб у што б там ні стала «прабіць сцяну» кантралёраў.

Чуецца дзявочы голас:

— Прапусціце мяне, я з каманды журналістаў.

— Як ваша прозвішча?

— Саша Тулбусава,—адказвае дзяўчына і таропка знікае ў зале. Яна, вядома, не чула вясёлага смеху тых, хто добра ведаў капітана каманды КВЗ Сашу Тулбусава.

Знаходлівасць балельшчыкаў была відавочнай. А як жа каманды?

...Бадзёрая музыка запаўняе залу. Вядучыя Рая Жардзецкая і Генадзь Воўчынскі называюць састаў журы і запрашаюць каманду юрыдычнага факультэта на сцэну. Адзінаццаць членаў каманды ў прыгожых чорных касцюмах і капелюшах-цыліндрах вітаюць сваіх сапернікаў, каманду факультэта журналістыкі, а таксама журы і балельшчыкаў. Затым побач з імі з'яўляюцца журналісты. Пачынаецца гарачая барацьба вастраслоўя, гумару, знаходлівасці, трапнасці.

З першага паядынку каманда юрфака выходзіць пераможцай. Але журналісты не губляюць надзеі: усё яшчэ наперадзе.

Цікавыя конкурсы, якія патрабуюць шмат знаходлівасці, дасціпныя пытанні і адказы бадзёраць, узбуджаюць гледачоў. Нікога не ўбачыш тут з раўнадушным тварам. Робіць сваю справу журы, а балельшчыкам цяжка стрымаць захапленне, запал, і раз-пораз у зале з'яўляюцца трапныя лозунгі-плакаты, не пазбаўленыя сакавітага студэнцкага гумару.

Але вось члены журы прафесар М. М. Авакаў, дацэнты П. І. Ткачоў і М. І. Крукоўскі, аспірант Юрый Кажушкоў, адказны за культурна-масавую работу ў парткоме БДУ М. Д. Ціва падводзяць вынікі апошняга конкурсу, і вядучыя аб'яўляюць канчатковы лік — 40—35. З такім вынікам закончылася сустрэча. Пад бурныя апладысменты балельшчыкаў каманда-пераможца факультэта журналістыкі пакінула сцэну.

Сустрэча паказала, што КВЗ жыве, што падобныя турніры — гэта весела, цікава, захапляюча. Спадзяемся, што наступныя сустрэчы паміж камандамі КВЗ іншых факультэтаў будуць яшчэ больш цікавыя. А самая моцная каманда, якая пераможа ў фінальнай сустрэчы, што адбудзецца ў снежні г. г., атрымае права на паездку ў любы горад СССР і сустрэчу з камандай любой вну абранага горада.

Няхай пашчасціць вам, вясёлыя і знаходлівыя!

Л. БЫСТРОВА.

*На здымку А. ЛАСМІНСКАГА вы бачыце удзельнікаў турніру, членаў каманды КВЗ факультэта журналістыкі.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 434. АТ 09197